Ларыса Таірава

# ПЕРАМОГА НЯПРЭСТЫЖНАЙ ДОМРЫ

Пасьпяховыя выступленьні беларускіх музыкантаў на самых розных спаборніцтвах зрабіліся ў апошні час звычайнай зьявай. Але сапраўды неардынарная падзея — перамога дамрыста Мікалая Марэцкага, які заваяваў 1-ую прэмію і званьне лаўрэата на I Міжнародным конкурсе «Кубак Поўначы», што адбыўся нядаўна ў Чарапаўцы і аб'яднаў выканаўцаў на народных інструментах. Разам зь Мікалаем у гэтым конкурсе прымалі ўдзел нашы вядомыя цымбалісткі Ларыса Рыдлеўская і Вольга Мішула, якія таксама вярнуліся пераможцамі (першая і другая прэміі). Ніколі яшчэ народнаінструментальнае выканальніцтва Беларусі ня мела такога «букета» важкіх узнагарод.

Кожны з музыкантаў заслугоўвае асобнага атрыкула, але гаворка сёньня пойдзе пра Мікалая Марэцкага. Па-першае, ён зьяўляецца мацнейшым сярод 35 лепшых дамрыстаў былога Саюза (і гэта ў 39 гадоў!). Па-другое, Мікалай стаў пераможцам на адным з самых няўдзячных і працаёмкіх інструментаў, якім зьяўляецца домра.

Зусім нядаўна домру лічылі чыста аркестравым ці ансамблевым інструментам абмежаваных магчымасьцей. Калі са сцэны гучыць адна толькі скрыпка або гітара, гэта зразумела, але каб хто-небудзь адважыўся выйсьці на сцэну з домрай, каб скарыць сэрцы слухачоў, такога ня было. Мікалай Марэцкі быў першым, хто пачаў выступаць на сцэне Белдзяржфілармоніі ў 1988 годзе як саліст-дамрыст. Дзякуючы посьпехам айчыннай педагогікі і такім выканаўцам, як М. Марэцкі, домра заняла сваё годнае месца на канцэртнай эстрадзе. У яе зьявілася нямала аматараў і прыхільнікаў, якія захапляюцца яе непаўторным гучаньнем, багацьцем тэхнічных і выразных магчымасьцей.

Нарадзіўся Мікалай у Магілёве. У іх вялікай сям'і вельмі любілі музыку. І таму невыпадкова чацьвёра зь пяці братоў зрабіліся прафесійнымі музыкантамі. Прычым усе яны ня былі прыняты ў музычную школу, па прычыне «адсутнасьці музычных здольнасьцей». Гэты кур'ёзны эпізод стаў фактам біяграфіі многіх выдатных музыкантаў (вялікі Вердзі ў гэтым сэньсе не выключэньне). Свае першыя музычныя ўражаньні Мікалай зьвязвае з ансамблем Палаца піянераў, дзе ён упяршыню ўзяў у рукі домру. Чаму менавіта яе? Бо ва ўсе часы домра была самым дэмакратычным і даступным інструментам.

Зь вялікай цяплынёй успамінае М. Марэцкі сваіх настаўнікаў — А. Драбышэўскага, які ў той час працаваў у Магілёўскім музвучылішчы, Г. Жыхарава, І. Красна-



Мікалай Марэцкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ярцава і прафесара Г. Асмалоўскую, якія заклалі добры падмурак для яго далейшай прафесійнай дзейнасьці, спрыялі разьвіцьцю мастацкага густу і тэхнічнага майстэрства.

Яшчэ ў Белдзяржканьсерваторыі, калі мы зь Мікалаем сядзелі за адным пультам у народным аркестры, выявіліся яго выдатныя выканальніцкія дадзеныя: віртуозная тэхніка, яркі тэмперамент, надзвычай шырокая палітра гукавых фарбаў. Пераіграўшы амаль усю арыгінальную музыку, усё лепшае, што створана для домры, Марэцкі ўзяўся за вельмі складаны скрыпічны рэпертуар. У гэты перыяд ім былі выкананы такія творы, як Ронда-капрычыёза Сен-Санса, капрысы Паганіні, канцэрты Мендэльсона і Моцарта. Але бясспрэчнай вяршыняй у гэтым пераліку зьяўляюцца «Д'ябальскія трэлі» Тарціні. Памятаю, як ён літаральна ашаламіў публіку адважным выкананьнем гэтага найскладанейшага сачыненьня, даступнага далёка ня ўсім скрыпачам, ня кажучы ўжо пра дамрыстаў. Бо што такое домра ў параўнаньні са скрыпкай? Тыя-ж 4 струны, той жа строй, што і ў скрыпцы, і нават лады, якія дазваляюць адразу адшукаць патрэбны гук. Але калі скрыпачу дастаткова лёгкага дотыку пальцаў, каб атрымаць гук, дык дамрысту для гэтага неабходна прыкласьці сілу — 8 кг кожным пальцам! Цяпер можна сабе ўявіць, што такое выканаць на домры Тарціні зь яго двайнымі, сапраўды д'ябальскімі трэлямі! Тады гэта здавалася неверагодным.

Са студэнцкіх гадоў у ім ясна праглядаў дух сьмелага эксьперыментатара. Такі чалавек, як Марэцкі, ня можа задавальняцца дасягнутым. Ён увесь час знаходзіцца ў стане творчага пошуку, нязьменна спрабуючы сябе ў новай якасьці. Кола яго музычных інтарэсаў сягае далёка за межы чыста народнага жанру. У выніку такога творчага эксьперыменту ў 1983 годзе ўзьнік унікальны дуэт домры і гітары — Марэцкага і Жывалеўскага. Яшчэ студэнтам каньсерваторыі Валерый Жывалеўскі вылучаўся сваёй разнастайнай адоранасьцю. Невыпадкова, што два таленавітыя музыканты знайшлі адзін аднаго. Іх творчае супрацоўніцтва аказалася ў такой ступені плённым, што прынесла ім бясспрэчную перамогу на VII Усесаюзным конкурсе артыстаў эстрады ў Маскве. Нечаканае, рэдкае і дзівосна гарманічнае спалучэньне домры і гітары, ды яшчэ ў жанры эстрады, такім нязвычайным для народнікаў, зьявілася сапраўднай сенсацыяй для публікі і членаў журы. Выконваючы эстрадную музыку Глебава, Шпянёва і класічныя мініяцюры Шастаковіча, беларускія музыканты паказалі віртуознае валоданьне сваімі інструментамі, тонкі мастацкі густ і бліскучае ўменьне аранжыроўкі.

Здавалася, усе магчымыя вяршыні заваяваны. Перамога на такім прэстыжным конкурсе адчыняла маладым артыстам усе дзьверы канцэртнай эстрады. Але ... выдатны ансамбль праіснаваў тады нядоўга і распаўся гэтак-жа хутка, як і ўзьнік. Межы дуэта для такіх маштабных асоб, як Марэцкі і Жывалеўскі, аказаліся цеснымі. І яны пайшлі кожны сваім непаўторным шляхам.

Супрацоўніцтва з рознымі музыкантамі, удзел у самых разнастайных ансамблях дазволілі Мікалаю набыць бясцэнны вопыт ансамблевай ігры, уменьне тонка і гнутка музіцыраваць з артыстамі самага рознага амплуа, узроўню і таленту. А сувязь з такімі музыкантамі, як Я. Глебаў, А. Шпянёў, І. Лучанок, Н. Гайда і інш., адшліфавала выканаўчае майстэрства М. Марэцкага, пашырала яго мастацкія далягляды. Творы беларускіх аўтараў займаюць належнае месца ў яго рэпертуары. Бязумоўнай мастакоўскай удачай М. Марэцкага зьяўляюцца трыпціх «Музычныя эскізы» А. Шпянёва, «На скрыжаваньні» У. Кур'яна, «Іспанскі трыпціх» А. Белашыцкага, творы А. Рашчынскага, Р. Суруса і іншых кампазітараў.

Марэцкі ніколі не стаіць на месцы ў сваім прафесійным росьце. Гэты чалавек пастаянна, штодзённа самаўдасканальваецца, адточвае ня толькі сваё выканаўчае майстэрства, але і свой інтэлект, шукаючы натхненьне часам у самых розных галінах музычнага мастацтва. Таму заканамерна, што сярод сваіх музычных аўтарытэтаў Мікалай назваў Хейфіца, Ойстраха, Растраповіча, Рыхтэра, Цыганкова. Мастацтва такіх знакамітых музыкантаў — гэта ня толькі прадмет захапленьня М. Марэцкага, гэта яшчэ і своеасаблівая школа. І ў гэтым сэньсе становіцца зразумелым зварот музыканта да творчасьці А. Месіяна, Ф. Пуленка, К. Дэбюсі. Асаблівую складанасьць уяўляе п'еса «Трысьцё» Ф. Куперэна, напісаная для клавесіна. Сваім пералажэньнем і выдатным выкананьем гэтай элітарнай музыкі, разьлічанай на вытанчаных гурманаў і сьпецыялістаў, Мікалай пакарыў журы конкурсу «Кубак Поўначы». Як пакарыў фіналам Фартэпіяннага канцэрта соль-мінор К. Сен-Санса. Фартэпіянны канцэрт на домры?! Ці магчыма такое? Аказваецца — магчыма. Цяжка сабе ўявіць, але Марэцкаму ўдалося «ўкласьці» фартэпіянную клавіятуру канцэрта Сен-Санса ў 4 домравыя струны і пры гэтым захаваць мастацкія вартасьці твора.

І гэта — яшчэ адно сьведчаньне таленту Марэцкага, неардынарнасьці яго музычнага мысьленьня. Ён вывеў домру на новыя абсягі інструментальнага мастацтва, даказаўшы што на гэтым інструменьце можна іграць амаль усё. Класічна строгая манера ігры Марэцкага, пазбаўленая зьнешніх эфектаў, вызначаецца

## ХРОНІКА мастацкага жыцьця

### Мінск

«Пахвала сьвятлу» — так арганізатары і мастачка Алена Кароткая назвалі выставу ў Рэспубліканскай мастацкай галерэі. На карцінах — асаблівы сьвет. У ім жывуць сваім жыцьцём людзі-клоуны, плаваюць рыбы з сумнымі чалавечымі вачыма, растуць дзіўныя кветкі... «У сваёй творчасьці я шукаю ісьціну. Але ісьціна заўсёды суб'ектыўная. Няма толькі дрэннага ці толькі добрага. Для мяне ісьціна ў тым, што сьвет складаны і шматслойны, празрысты і ранімы...» — гаворыць мастачка, чые творы сёньня ўжо ёсьць у прыватных калекцыях ня толькі ў Беларусі, але і ў Швецыі, Даніі, Ізраілі, Польшчы.

●

Навукова-інжынерны цэнтр «Белтэхналогія», створаны пры Беларускай політэхнічнай акадэміі, па роду сваёй дзейнасьці даволі далёка стаіць ад праблем мастацтва. Але гэта не перашкодзіла яму ў сваіх сьценах адкрыць мастацкую галерэю «6-ая лінія». Ужо адбыўся і першы вернісаж, які быў цікавы сінтэзам мастацтваў — жывапісу і музыкі. Група «Князь Мышкін» прапанавала складаныя джаз-рок-авангардныя кампазіцыі, а карціны мастакоў-авангардыстаў былі працягам музыкі. Вось імёны ўдзельнікаў выставы: У. Акулаў, І. Ермакоў, А. Жданаў, В. Нудноў, В. Пятроў, Н. Рачкоўская, А. Ржэўскі, А. Родзін, А. Тарановіч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

